# Інтэлектуальная гульня для пажылых
# у рамках акцыі "Бяспека ў кожны дом»

15 лютага 2019 года ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна ў рамках акцыі “Бяспека ў кожны дом” прайшло пазачарговае пасяджэнне Школы “Бяспека грамадзян сталага ўзросту". Супрацоўнікі Ашмянскага МНС далі карысную і неабходную інфармацыю аб правілах пажарнай бяспекі для пажылых грамадзян. Замацаваць веды па дадзенай тэматыцы дапамагла інтэлектуальная гульня, якую правялі члены БМООСП. Адкрыты дыялог і цікавыя гульнявыя заданні далі магчымасць пажылым грамадзянам атрымаць шмат патрэбнай і карыснай інфармацыі.





